Падпісацца на «Народную Волю» можна ў любы дзень у любым паштовым аддзяленні ці ў спецыялізаваных пунктах «Белсаюздруку».

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

№ 37 (4392)

14 мая 2019 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

ВЯЛІКАЯ ПАЛІТЫКА



Уладзімір МАКЕЙ:

Беларусь спадзяецца, што пагадненне з Еўрапейскім Саюзам аб спрошчаным візавым рэжыме і рэадмісіі будзе падпісана да канца года

Знаходзячыся ў Бруселі з нагоды 10-годдзя «Усходняга партнёрства», міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь Уладзімір Макей яшчэ патлумачыў, што прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка не прыехаў у сталіцу ЕС таму, што адносіны Беларусі і Еўрасаюза пакуль не дасягнулі дастаткова высокага ўзроўню. *«Візіт павінен быць максімальна выніковым і насычаным. Мы зыходзім з такіх падыходаў, але, думаю, у любым выпадку сустрэчы, якія мы тут праведзём, будуць важныя для ўсіх бакоў»*, – сказаў У.Макей.

ЛІЧБЫ

Што падаражэла?

За красавік інфляцыя ў Беларусі склала 0,04%, паведамляе Белстат. Ад пачатку года індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі вырас на 2,7%.

Харчовыя тавары за красавік падаражэлі на 0,2% у параўнанні з папярэднім месяцам (у параўнанні з пачаткам года рост коштаў склаў 3%). Кошты на нехарчовыя тавары выраслі ў параўнанні з сакавіком на 0,1% (ад пачатку года – на 1,7%).

А вось паслугі сталі таннейшыя на 0,2%.

СУД

Почему засекретили дело Сергея Ровнейко?

Как сообщалось, помощник президента – инспектор по Гродненской области **Сергей Ровнейко** был задержан в минувшем году за взятку в 200 тысяч долларов. Его взяли с поличным. Он тут же был отстранен от должности.

Деньги чиновнику передавали за благоприятное решение вопроса по организации сигаретного бизнеса.

Общественность надеялась, что суд будет открытым.

Но вот что сказала «Народной Воле» про дело Сергея Ровнейко пресс-секретарь Верховного суда **Юлия Ляскова:**

– Информация о судебном разбирательстве по уголовному делу в отношении Ровнейко относится к информации, распространение и (или) предоставление которой ограничено в силу статьи 17 Закона Республики Беларусь «Об информации, информатизации и защите информации».

В статье, на которую ссылаются в Верховном суде, говорится, что к информации, распространение и (или) предоставление которой ограничено, относится: *«информация о частной жизни физического лица и персональные данные; сведения, составляющие государственные секреты; служебная информация ограниченного распространения; информация, составляющая коммерческую, профессиональную, банковскую и иную охраняемую законом тайну; информация, содержащаяся в делах об административных правонарушениях, материалах и уголовных делах органов уголовного преследования и суда до завершения производства по делу».*

В Верховном суде не конкретизируют, что же на самом деле не позволяет сделать рассмотрение уголовного дела Сергея Ровнейко открытым. Все будет происходить за плотно закрытыми дверями. Узнаем только о приговоре.

Ирина КОЛЬЦОВА.

Жыццё альбо расстрэл?

Сёння калегія па крымінальных справах Вярхоўнага суда Беларусі будзе разглядаць апеляцыйную скаргу асуджанага да смяротнага пакарання жыхара Бабруйска Аляксандра Асіповіча.

Нагадаем, што ў кватэры, дзе праводзіў час падсудны Асіповіч ноччу 20 ліпеня мінулага года, былі знойдзены мёртвымі дзве маладыя жанчыны – Крысціна і Алеся.

9 студзеня 2019 года на выязным пасяджэнні Магілёўскага абласнога суда ў Бабруйску быў агучаны прысуд **Аляксандру Асіповічу** – вышэйшая мера пакарання. Зараз – слова за Вярхоўным судом.

– Як паказвае практыка, на апраўдальны прысуд спадзявацца асабліва не даводзіцца, – кажа каардынатар кампаніі «Праваабаронцы супраць смяротнага пакарання ў Беларусі» **Андрэй ПАЛУДА**. – Але мы, натуральна, верым, што справа хаця б будзе накіравана на новы перагляд Магілёўскай абласной калегіі па крымінальных справах, таму што да вышэйзгаданага працэсу таксама ўзнікае шмат пытанняў, якія неабходна высветліць.

Калі ж Вярхоўны суд пакіне рашэнне абласнога ў сіле, то Асіповіч, хутчэй за ўсё, будзе падаваць прашэнне аб памілаванні на імя прэзідэнта, а таксама будзе праходзіць працэдуру нагляднага абскарджвання. Не выключана таксама, што звернемся ў Камітэт па правах чалавека ААН.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ПРЯМАЯ ЛИНИЯ

В поле зрения

Почти 90% информации человек получает с помощью зрения. Но с годами из-за условий работы, возраста, наследственности глаза начинают хуже видеть.



Как защитить зрение и предупредить глазные болезни?
Как часто надо проходить осмотр у офтальмолога?
Как лечить воспалительные заболевания глаз?
Что делать, если поранили глаз?
Можно ли сделать амбулаторно операцию на веках (холязионы, вывороты, завороты век)?
Какие сегодня есть современные методы коррекции близорукости и дальнозоркости?

На эти и многие другие вопросы читателей «Народной Воли» ответит врач-офтальмолог высшей категории медицинского центра «ЛОДЭ» **Ирина Станиславовна Харланович.**

Звоните **в пятницу, 17 мая, с 12 до 14.00 по телефону 328-68-41**.

Присылайте свои вопросы заранее по почте или на электронный адрес: **nvonlineinfo@gmail.com** с пометкой **«Прямая линия».**

СІТУАЦЫЯ

«Завод кантралюем круглыя суткі»

Нагадаем: узвядзенне акумулятарнага завода пачалося ў Брэсце на прамысловай пляцоўцы «Аэрапорт» у свабоднай эканамічнай зоне. На прадпрыемстве будзе наладжаны поўны цыкл вытворчасці свінцова-кіслотных акумулятарных батарэй.

Многія жыхары лічаць, што прадпрыемства будзе пагражаць іх здароўю. Амаль 37 тысяч подпісаў супраць будаўніцтва завода былі перададзены ў Адміністрацыю прэзідэнта, аднак створаная ў сувязі са зваротам урадавая камісія не выявіла парушэнняў у рэалізацыі праекта па будаўніцтве завода.

Кожную нядзелю на плошчу Леніна ў Брэсце прыходзяць працаўнікі будаўніцтва акумулятарнага завода. Яны стаяць групамі, размаўляюць, абмяркоўваюць навіны, звязаныя з будаўніцтвам прадпрыемства, кормяць галубоў і… атрымліваюць за гэта штрафы.

– Зараз большая частка сіл скіравана на тое, каб кантраляваць працу завода кругласутачна, – распавядае брэсцкі актывіст **Алесь АБЛЯК**. – Як вядома, у другой палове красавіка тут працавала камісія па прыёмцы, але 30 красавіка акт на запуск вытворчасці так і не быў падпісаны. І ў той жа час мы не выключаем, што прадпрыемства ўжо працуе, таму выставілі кругласутачную варту. Людзі прыязджаюць, змяняюцца кожную гадзіну.

А мінулай ноччу намі была заўважана фура, якая выехала з тэрыторыі завода і накіравалася ў бок Мінска. Актывісты з дапамогай ДАІ спынілі машыну, пасля праверкі высветлілася, што фура цалкам загружана акумулятарамі. Праўда, пасля праверкі дакументаў вадзіцеля адпусцілі. І вось пытанне: калі завод яшчэ не мае права працаваць, то што за прадукцыю вывозяць з прадпрыемства? Альбо завод тайна працуе без дазволу? Зараз будзем чакаць афіцыйнага адказу кіраўніцтва завода на гэты конт.

– Колькі зараз людзей на варце?

– 10–30 чалавек дакладна ёсць, але ў розны час па-рознаму.

– Ці працягваеце вы дыялог з мясцовымі ўладамі з нагоды гэтай сітуацыі?

– Спрабуем весці гутарку з аблвыканкамам, хаця яго старшыня чамусьці пазбягае асабістых сустрэч з намі. Але амаль штодзень мы накіроўваем лісты ў розныя інстанцыі, і, дарэчы, пасля начнога выпадку з фурай напісалі адпаведныя заявы і ў КДБ, і ў Камітэт дзяржкантролю. Няхай правяраюць, як такая сітуацыя суадносіцца з законам.

– Але ж большасць жыхароў Брэста не далучаюцца да вашых акцый пратэсту…

– Людзі проста баяцца страціць працу, а таму калі і пратэстуюць, то робяць гэта непублічна.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ



Елена ЗАХАРЕНКО:

«Хочется быть ближе к тому, что роднее твоей душе…»

20 лет назад практически в центре Минска несколько человек напали на экс-министра внутренних дел генерала Юрия Захаренко и увезли его в неизвестном направлении. Точка в расследовании уголовного дела до сих пор не поставлена.

Семья Юрия Захаренко почти 20 лет живет в Германии – опасаясь преследований, жена и обе дочери экс-министра попросили политического убежища.

«Народная Воля» расспросила старшую дочь Юрия Захаренко Елену о жизни на чужбине.

Связаться с Еленой оказалось непросто.

– Я ведь практически не бываю дома, все время работаю, – *объясняет Елена Захаренко.* – У меня только один выходной – воскресенье. Тем, кто не получил в Германии высшего образования, приходится очень много работать, чтобы элементарно свести концы с концами. Я прихожу поздно – часов в 10 вечера.

Мама не работает, она уже получает пенсию. У нее небольшая квартира (полторы комнаты) недалеко от меня. Юля тоже не работает…

– А почему?

– Здесь не так просто найти работу. Это как повезет. Трудно устроиться даже немцам, которые тут всю жизнь прожили, а что уже говорить о нас… Иностранцы – это другая категория людей…

– У вас, видимо, немецкий в совершенстве.

– Не совсем. Вот как раз учу лексику про бриллианты-диаманты. Дело в том, что я работаю в ювелирном магазине. И поэтому изучаю все, что связано с золотом, серебром, драгоценными камнями. Нелегко сразу свободно ориентироваться в этой сфере, это все-таки специальная лексика. Так что даже в моем возрасте приходится постоянно повышать квалификацию.

– Зато все время развиваетесь, получаете новые знания, мозг тренируете.

– Конечно! Но как бы там ни было, здесь для меня все равно все другое. Чужая земля, другая культура. А хочется быть ближе к тому, что роднее твоей душе.

– Лена, если не ошибаюсь, у вас ведь юридическое образование?

– Да, но это было в прошлой жизни. Очень давно... Это уже не имеет никакого значения. Здесь люди начинают жизнь с чистого листа.

– Сейчас у вас тоже неплохая работа…

– В Германии уже жизнь идет на американский лад. Сегодня многие товары немцы заказывают в интернете. Это удобно, не надо искать место для парковки автомобиля в городе, к тому же здесь это дорого. А в интернете заказал любой товар – тебе привезли все на дом. Обычные магазины – это уже как старая традиция…

– Получается, вы одна обеспечиваете всю семью? И маму, и сестру?

– Нет-нет. Каждый живет самостоятельно. Я обеспечиваю только себя и своего сына. Это моя главная ответственность. И мне кажется, у меня получилось с этим справиться.

Кириллу уже 20 лет. Он оканчивает школу с направлением по специальности, сейчас у него последние экзамены. Уже почти самостоятельный, взрослый и красивый парень. По-прежнему мечтает быть полицейским. Как дедушка. Об этой своей мечте сын впервые сказал еще в четыре года. И до сих пор не поменял решения.

Недавно немка, которая нас сопровождает в Германии почти все 20 лет, была у него в школе. Она как раз принимала у себя дома людей из Беларуси. И в составе делегации оказалось несколько человек, которые были знакомы с моим отцом. Увидев Кирилла, они рассказали ему про дедушку. Сын сказал: жаль, что я его не знал…

– Лена, я видела ваши фотографии в «Фейсбуке». Вы просто расцвели! А как, если не секрет, у вас с личной жизнью?

– Не думаю, что при моем напряженном рабочем графике личная жизнь возможна. У меня есть главная ответственность – сын. Несмотря на то, что он уже взрослый парень, нужно все равно следить, чтобы он не поддался различным соблазнам, которые могут помешать его будущему (а их здесь немало!). И пока я не буду окончательно уверена, что его можно отпустить в самостоятельную жизнь, одного, я должна находиться рядом, поддерживать его. Это моя главная миссия.

– Ольга Борисовна помогает вам и сестре с внуками?

– Конечно. Если мы нуждаемся в ней, мама всегда приходит к нам на помощь.

– Как у нее со здоровьем?

– Сейчас стало лучше. Она уже и на велосипеде часто ездит, и физически окрепла. У нее были проблемы с сердцем. Мама и пенсию получила досрочно из-за проблем со здоровьем.

Самое ужасное, что ей не зачли тот трудовой стаж, который у нее был. Она получает минимальную пенсию из всех возможных. Как будто никогда и нигде не работала. Все, что было в прошлом, осталось в прошлом…

– Этих денег хватает на жизнь?

– Она получает 400 евро в месяц. Вернее, это то, что у нее остается после оплаты квартиры. Еще из этих денег 50 евро отдает за свет. Получается, на жизнь остается 350 евро.

Но примерно столько выходит и у меня, несмотря на то, что я все время пропадаю на работе. Зарплата у меня около 1300 евро, 615 плачу за квартиру, и все остальное – нам на жизнь с ребенком.

Поэтому здесь люди и стремятся не работать, но сохранить свое здоровье, чем работать и в конечном итоге получать примерно такие же деньги.

– Недавно исполнилось 20 лет, как случилась беда с вашим отцом. Наверное, 7 мая ваш телефон разрывался от звонков…

– Я дома практически не бываю. Может, кто-то и звонил…

Конечно, я просматриваю новости в «Фейсбуке». И хорошо, что «Правовая помощь населению» еще что-то делает и не забывает о теме громких исчезновений, выкладывает какие-то ролики с отцом.

Но…

Несмотря на то, что прошло 20 лет, мне больно все эти видео смотреть. Больно слышать высказывания людей, которые знали отца и не знали. Годы идут, а боль никуда не уходит. Она становится хронической. Это рана, которая все время кровит. Наверное, примерно так же вам скажут о своих чувствах близкие всех похищенных и убитых.

– В Минске осталась квартира, в которой вы жили. Вы можете ею как-то распорядиться?

– Конечно нет! Отца ведь не признают умершим. Несмотря на то, что прошло 20 лет со дня насильственного исчезновения. Наверное, это единственный случай такой.

Власть ненавидит Юрия Захаренко даже после его смерти. Иначе я не могу это никак объяснить.

У отца была очень сильная энергетика. И я уверена, что он даже в снах приходит к своим убийцам…

– Когда мы с вами разговаривали пару лет назад, вы сказали, что находитесь в шаге от получения немецкого гражданства…

– Я получила немецкое гражданство для себя и своего сына. Кирилл, повторюсь, имеет цель работать в немецкой полиции, а без гражданства это невозможно. Мама и сестра немецкого гражданства не имеют.

(Окончание на 2-й стр.)

ДА ВЕДАМА

На МКАД абмяжуюць рух транспарту

Прычына – трэніроўкі парада войскаў Мінскага гарнізона на ваенным аэрадроме “Ліпкі”.

Як паведамляе “Мінсктранс”, праезд для асабістага і грамадскага транспарту будзе закрыты па маршруце руху ваеннай тэхнікі: вуліца Заснавальнікаў – вуліца Скарыны – МКАД – аэрадром “Ліпкі”, а таксама вуліца Заснавальнікаў – траса Н9067.

Калона тэхнікі паедзе на аэрадром 14, 21, 28 мая і 4, 11 чэрвеня ў 04.50. Вяртацца тэхніка будзе 16, 23, 30 мая і 6, 13 чэрвеня ў 19.50. Калона будзе праходзіць па названым маршруце каля 30 хвілін.

ВЕРДЫКТ

Больш за 1000 рублёў штрафу

Грамадскага актывіста і IT-кансультанта **Глеба Рубанава** прызналі вінаватым у распаўсюджванні экстрэмісцкіх матэрыялаў. Суд Савецкага раёна Мінска прысудзіў яму штраф у 1020 рублёў (40 базавых велічынь).

Рубанава абвінавачвалі ў тым, што 5 сакавіка ён распаўсюдзіў у “Фэйсбуку” абрэвіятуру, прызнаную ў Беларусі экстрэмісцкай. Пад яго імем была размешчана спасылка на пост іншага карыстальніка “Фэйсбука”.

Рубанаў не прызнаў сябе вінаватым і адмовіўся адказваць на пытанне суддзі, ці зарэгістраваны ён у “Фэйсбуку”, бо, як ён заявіў, не павінен даказваць сваю невінаватасць і сведчыць супраць сябе.

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

Перапіска з міліцыяй, штрафы, суды…

Як у Беларусі праходзяць вулічныя акцыі пасля ўнесеных сёлета змен у Закон «Аб масавых мерапрыемствах», якія абавязалі арганізатараў акцый плаціць за паслугі міліцыі, камунальшчыкаў і медыкаў? Ці існуе падобная практыка ў нашых суседзяў і ў іншых краінах свету?

Даведка «Народнай Волі»

У студзені 2019 года ў Беларусі ўступілі ў сілу змены ў Закон «Аб масавых мерапрыемствах» і была прынята пастанова Савета міністраў №49, якая зацвердзіла парадак аплаты паслуг міліцыі па ахове грамадскага парадку падчас масавых акцый, выдаткаў на медыцынскае абслугоўванне і прыбіранне тэрыторыі пасля правядзення такіх мерапрыемстваў.

Цяпер, згодна з пастановай, пасля атрымання дазволу (або пры адсутнасці забароны) на правядзенне акцыі яе арганізатары не пазней як за два дні да запланаванай даты павінны заключыць дамовы аб ахове грамадскага парадку, медыцынскім абслугоўванні, прыбіранні тэрыторыі, а потым у 10-дзённы тэрмін заплаціць, напрыклад, міліцыі за ахову грамадскага парадку наступныя сумы:

3 базавыя велічыні (зараз 76,5 рубля) – калі ў акцыі бяруць удзел да 10 чалавек;

25 б.в. (637,5 рубля) – ад 11 да 100;

150 б.в. (3825 рублёў) – ад 101 да 1000;

250 б.в. (6375 рублёў) – больш за 1000 чалавек.

Значная заўвага: змяненні ў заканадаўстве не закранулі мерапрыемстваў, правядзенне якіх фінансуецца за кошт сродкаў рэспубліканскага або мясцовых бюджэтаў або іншыя прадугледжаныя законам выпадкі, сярод якіх афіцыйныя мерапрыемствы, што праводзяцца па рашэнні дзяржаўных органаў, а таксама ўсе передвыбарныя кампаніі.

РЭАЛІІ

«Усё скончыцца судом…»

Праваабарончыя арганізацыі і дэмакратычныя партыі адразу ж рашуча асудзілі змены ў заканадаўстве, заявіўшы, што *«памеры выдаткаў на правядзенне масавых акцый уяўляюць сабой сур'ёзную перашкоду ў рэалізацыі гарантаваных канстытуцыйных свабод»*. Адразу ж з'явіліся і першыя прэцэдэнты, якія сведчылі, што гэтыя апасенні небеспадстаўныя.

Так сёлета ўпершыню за 30 гадоў у Мінску не адбылася традыцыйная акцыя «Чарнобыльскі Шлях». Яе арганізатары адмовіліся ад правядзення шэсця і мітынгу менавіта па прычыне немагчымасці аплаціць выдаткі па правядзенні мерапрыемства – прыблізна 5737 беларускіх рублёў, альбо больш за 2700 долараў ЗША.

Па гэтай жа прычыне адмовіліся ад правядзення першамайскага сходу і прадстаўнікі незалежных прафсаюзаў.

Дагэтуль цягнецца спрэчка арганізатараў Дня Волі–2019 у Кіеўскім скверы Мінска з міліцыяй. Праваахоўнікі першапачаткова выставілі арганізатарам святкавання рахунак у 3825 рублёў (150 б.в.), а потым павялічылі суму да 6375 рублёў (250 б.в.), спаслаўшыся на тое, што ўдзельнікаў акцыі было больш за тысячу. Арганізатары Дня Волі ўвогуле адмовіліся плаціць, бо палічылі, што паслугі міліцыі былі няякасныя (напрыклад, падчас акцыі невядомыя ў цывільным схапілі Зміцера Дашкевіча і Віталя Рымашэўскага і павезлі ў невядомым накірунку, а супрацоўнікі міліцыі бяздзейнічалі) і даслалі ў ГУУС Мінска прэтэнзію. Яшчэ не быў атрыманы адказ з міліцыі, а суд Цэнтральнага раёна сталіцы ўжо прыцягнуў да адміністрацыйнай адказнасці арганізатараў Дня Волі **Юрася Губарэвіча**, **Мікалая Казлова**, **Ігара Барысава** і **Вольгу Кавалькову**. За парушэнне парадку арганізацыі масавых мерапрыемстваў іх пакаралі штрафам у памеры 30 базавых велічынь (765 рублёў) кожнага. Зараз гэтае рашэнне суда палітыкі абскарджваюць.

«Дагэтуль яшчэ ідзе перапіска з міліцыяй па пытаннях канчатковай сумы, – кажа адзін з арганізатараў Дня Волі–2019, старшыня руху «За Свабоду» Юрась Губарэвіч. – *Мы склалі акт, у якім пазначана, што максімум, які мы можам заплаціць, акрэслены ў тых межах, пра якія было дамоўлена першапачаткова. Яны, як вядома, настойваюць на дадатковай суме. Адказу на акт пакуль няма. Але я думаю, што ўсё скончыцца судом. Альбо міліцыя падасць іск раней, альбо мы»*.

Ігар ЗАЛЕСКІ.

ПАРАЎНАЕМ!

Патэлефанаваць у паліцыю за 48 гадзін…

5 мая шэраг праваабарончых арганізацый Беларусі звярнуліся з супольнай заявай да дэпутатаў, урада і ўлад краіны з патрабаваннем унесці змены ў Закон «Аб масавых мерапрыемствах», прывёўшы яго ў адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі ў галіне правоў чалавека, і адмяніць пастанову ўрада №49.

Пакуль праваабаронцы чакаюць рэакцыі з боку дзяржаўных структур, «Народная Воля» вырашыла ўдакладніць, які парадак правядзення масавых мерапрыемстваў існуе ў нашых суседзяў, а таксама ў іншых краінах свету.



Трэба адзначыць, што літаральна кожная дзяржава сярод шэрагу заканадаўчых актаў мае і штосьці кшталту нашага закона аб масавых мерапрыемствах, і там грамадзянам таксама, як і ў Беларусі, дазволена мітынгаваць выключна па ўзгадненні з уладамі. Заяўкі на правядзенне масавай акцыі арганізатары падаюць у мясцовыя органы ў Польшчы, Літве, Латвіі, Вялікабрытаніі, Італіі, Іспаніі, Японіі, ЗША. У абавязковым парадку яны ўзгадняюць свае дзеянні з паліцыяй, паведамляюць пра меркаваную колькасць удзельнікаў, месца, час і дату правядзення акцыі, а таксама пазначаюць маршрут руху, калі мяркуецца шэсце. І звычайна рознагалоссі і спрэчкі ў грамадстве ўзнікаюць у сувязі з затрыманнямі пратэстоўцаў і штрафамі, якія ва ўсіх краінах дастаткова вялікія. Але што тычыцца падрыхтоўкі санкцыянаванай акцыі, то тут усё проста: атрымаў дазвол мясцовай улады – ідзі пратэстуй. Толькі ў некаторых штатах ЗША з арганізатараў масавых акцый патрабуюць аплаціць працу службы бяспекі і выдаткі на вываз смецця, якое застаецца пасля мітынгу.

У **Польшчы**, як расказалі нам у амбасадзе гэтай краіны ў Мінску, арганізатар акцыі выступае ў ролі юрыдычнай асобы і нясе адказнасць за падтрыманне парадку, прадухіленне інцыдэнтаў і г.д. Усе гэтыя задачы арганізатар павінен вырашаць самастойна альбо па жаданні можа звяртацца ў прыватныя ахоўныя агенцтвы за дапамогай у арганізацыі грамадскага парадку падчас акцыі. Паліцэйскія органы тым не менш таксама мусяць забяспечваць грамадскі парадак, абараняць правы грамадзян на правядзенне дэманстрацыі, і за гэта ім арганізатары масавага мерапрыемства, канешне ж, нічога не плацяць. Гэта абавязак паліцыі, яе праца.

У **Літве** дазвол на правядзенне акцыі даюць органы мясцовага самакіравання. На правядзенне пікета колькасцю да 10 чалавек увогуле ніякія дазволы не патрэбны: выходзь хоць да будынка парламента, хоць да прэзідэнцкага палаца і заяўляй пра свае патрабаванні. *«Што да акцый, то ў экстранным парадку дазвол можна атрымаць і за 3 дні,* – расказвае **Дайніс Радзевічус,** старшыня Саюза журналістаў Літвы. – *Арганізатары мусяць плаціць за некаторыя тэхнічныя моманты. Напрыклад, усталёўваецца сцэна, і, каб падвесці электрычнасць, трэба заплаціць. Ці мерапрыемства доўжыцца цэлы дзень, неабходны біяпрыбіральні, за іх таксама плацяць арганізатары акцыі. Але паліцыі, іншым дзяржаўным органам, вядома ж, ніхто не плаціць. Гэта іх праца, якая аплачваецца з нашых падаткаў»*.

У **Германіі** заканадаўства ў частцы правядзення масавых акцый лічыцца адным з самых ліберальных у Еўропе. Літаральна ва ўсіх землях не патрабуецца нават дазвол улад на правядзенне мітынгу альбо дэманстрацыі. Арганізатары толькі абавязаны за 48 гадзін да пачатку акцыі паведаміць аб яе правядзенні (дзе, калі і якая мяркуецца колькасць удзельнікаў) у паліцыю, прычым гэта можна зрабіць нават праз інтэрнэт. Паліцыі прадпісваецца ўсяляк падтрымліваць арганізатараў у ходзе мерапрыемства і пільна сачыць за парадкам. Прычым галоўная задача паліцыі – забяспечыць беспершкоднае правядзенне мерапрыемства.

У **Францыі,** дзе з канца мінулага года бурна пратэстуюць «жоўтыя камізэлькі», аказваецца, дазвол на правядзенне маніфестацыі не патрабуецца. *«Дзейнічае заяўны прынцып,* – расказалі ў амбасадзе Францыі ў Мінску. – *Арганізатары акцыі проста паведамляюць мэрыі і паліцыі пра маніфестацыю і не чакаюць адказу, ён можа прыйсці толькі ў тым выпадку, калі ў правядзенні акцыі адмоўлена. Ну і зразумела, што ніякім дзяржаўным служачым – паліцыі, медыкам, камунальшчыкам – ніхто не плаціць, бо яны ўтрымліваюцца за кошт падаткаплацельшчыкаў»*.

Ва **Украіне** таксама дазвол на правядзенне масавай акцыі не патрэбны, арганізатарам мерапрыемства дастаткова за некалькі дзён паведаміць мясцовым уладам і паліцыі, дзе будзе праводзіцца акцыя і якая колькасць удзельнікаў плануецца. Зразумела, што ніхто ні за што нікому не плаціць.

У **Расіі** таксама дзейнічае паведамляльны прынцып правядзення масавых мерапрыемстваў, аднак Савет Еўропы крытыкуе РФ за тое, што насамрэч гэта працэдура ператвараецца ў абавязак атрымаць дазвол на правядзенне масавай акцыі, і часцяком улады не ўзгадняюць публічныя мерапрыемствы, арганізатарамі якіх з'яўляюцца прадстаўнікі апазіцыі, альбо пасылаюць апазіцыю мітынгаваць далёка ад цэнтра на перыферыйныя пляцоўкі. Але ж калі дазвол атрыманы, грошай на аплату паслуг паліцыі, камунальшчыкаў і медыкаў ад арганізатараў мерапрыемства не патрабуюць.

У **Казахстане** масавыя мерапрыемствы праводзяцца толькі з дазволу ўлад і толькі ў месцах, якія вызначаны мясцовымі органамі кіравання. Звычайна гэта далёка не цэнтральныя вуліцы і плошчы гарадоў. І гэта, дарэчы, адна з прычын таго, што казахскія актывісты перастаюць карыстацца правам на правядзенне мірных сходаў. І, напрыклад, нядаўнія акцыі пратэстаў супраць датэрміновых прэзідэнцкіх выбараў, якія праходзяць у Казахстане з канца красавіка, былі несанкцыянаваныя. Што тычыцца практыкі браць з пратэстуючых грамадзян грошы за паслугі паліцыі, камунальных і медыцынскіх службаў, то яна ў Казахстане адсутнічае. *«Ва ўсякім разе пакуль. Таму што Казахстан вельмі ўважліва сочыць за практыкай іншых краін з пункту гледжання ўзмацнення кантролю за масавымі акцыямі»,* – горка жартуе палітолаг **Дасым Сатпаеў**.

Дарэчы, у Еўропе існуюць правілы правядзення масавых мерапрыемстваў. *«Яны выкладзены ў зборніку «Кіруючыя прынцыпы АБСЕ па свабодзе мірных сходаў», у якім акумулявана найлепшая практыка на падставе рашэнняў Еўрапейскага суда і Камітэта правоў чалавека ААН і ў якім прапісана, як мусяць рэгулявацца пытанні правядзення масавых акцый*, – кажа юрыст і праваабаронца Валянцін Стэфановіч. – *Гэта стандарты, сфармуляваныя ўплывовымі арганізацыямі. Канешне, усё павінна аплачвацца за кошт бюджэтаў муніцыпалітэтаў, таму што гэта абавязацельства дзяржавы – ствараць для сваіх грамадзян умовы для рэалізацыі праў і свабод»*.

Марыя ЭЙСМАНТ.

РЭГІЁН

4,4 тысячы бязвізавых турыстаў

Столькі замежных гасцей з 1 па 9 мая прыняў Гродна. Паводле афіцыйных дадзеных, гэта рэкордная колькасць за ўвесь час існавання бязвізавай зоны ў рэгіёне.

Традыцыйна больш за ўсё турыстаў у Гродна прыбываюць з краін-суседак – Літвы, Польшчы і Латвіі. На чацвёртым месцы – Германія. З пачатку 2019 года ў рэгіёне пабывалі звыш 36,6 тысячы бязвізавых турыстаў з 33 краін свету. За аналагічны перыяд мінулага года Гродна і наваколлі прынялі каля 18 тысяч такіх гасцей.

Аляксей МІХАЛЁЎ.

ПРАЦЭС

Судзяць чарговага фігуранта «справы медыкаў»

*На пачатку мая ў судзе Фрунзенскага раёна Мінска пачаўся працэс па справе намесніка галоўнага ўрача медцэнтра МТЗ **Сяргея Семяжона**.*

Яго затрымалі яшчэ ў чэрвені мінулага года ў рамках гучнай справы аб карупцыі ў сферы медыцыны. Семяжона абвінавачваюць у атрыманні хабару ў 28 тысяч долараў. Ён прызнае віну часткова.

Характэрна, што аб пачатку гэтага судовага працэсу нідзе не было афіцыйнай інфармацыі. І гэта ўжо становіцца тэндэнцыяй. Справа ў тым, што журналістам не было вядома і пра іншыя судовыя слуханні з ліку «справы медыкаў» – напрыклад, пра суд над былым галоўным урачом Мінскай абласной бальніцы **Андрэем Каролька**, урачом-эндаскапістам 9-й клінічнай бальніцы Мінска **Андрэем Саўчанкам**. Хаця пра першыя судовыя працэсы (дзе і калі яны адбудуцца) – над былым замміністра аховы здароўя **Ігарам Ласіцкім,** экс-дырэктарам РНПЦ траўматалогіі і артапедыі, акадэмікам **Аляксандрам Бялецкім**, былым кіраўніком упраўлення аховы здароўя Гродзенскай вобласці **Андрэем Стрыжаком** – прэс-служба Вярхоўнага суда прадстаўнікоў СМІ інфармавала.

Іван ШЫРОКІ.

ЭКСПЕРТЫЗА

Якой будзе кампенсацыя за «брудную» нафту?

Беларусь можа патрабаваць ад Расіі кампенсацыю за аварыю на нафтаправодзе «Дружба» ў памеры ад 271,3 мільёна да 435,3 мільёна долараў.

Такія падлікі прыводзіць расійскае выданне «Ведомости». У суму, разлічаную расійскімі экспертамі, уваходзіць недаатрыманая выручка беларускай кампаніі «Гомельтранзіт-Дружба» за транзіт нафты на Захад за 14 дзён прастою нафтаправода (29–35 млн долараў), будучыя страты ў выручцы ад зніжэння прапускной здольнасці «Дружбы» з 65 да 40 млн тон у год (142–300 млн долараў да канца 2019 года) і шкода ад вымушанага спынення вытворчасці на беларускіх НПЗ (гэтыя страты могуць складці да 280 млн долараў).

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

«Хочется быть ближе к тому, что роднее твоей душе…»

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

– У вас была мечта приехать в Беларусь. Теперь вы, наверное, можете это сделать не как политбеженка, а как гражданка Германии.

– Я могу приехать в Беларусь. И давно могла. Могла увидеть живыми своих бабушек. Меня, может, никто и никогда не поймет…

Вообще-то я сильный человек. И могу терпеть сильнейшие удары судьбы. И переживать потом их внутри себя. Но мне просто больно! Больно видеть улицы, по которым ходили я и мой отец. Больно смотреть на улыбающихся людей, которые там живут. Мне больно и страшно встречаться со своим прошлым, которое оставило огромную рану в моем сердце.

Наверное, кто-то легче все это переносит, и даже может приезжать в Беларусь. А я поняла, что не могу. Я ранимый человек. Для моей психики это будет мощнейший удар.

Смогу ли я потом дальше жить в Германии, что-то учить, за что-то бороться да и просто улыбаться людям на своей работе?..

Я очень тяжело перенесла смерть своих обеих бабушек. У меня долгие недели и месяцы было очень тяжелое психологическое состояние. Конечно, я часто корю себя: а могла бы приехать, увидеть, обнять…

Да не могла!

Мне больно видеть портреты отца в бабушкином доме, больно войти в его комнату, где наверняка еще остался неуловимый запах его вещей и моего счастливого детства…

– 7 мая вы как об отце вспоминали? Свечку в церкви поставили?

– Я работаю с раннего утра и до позднего вечера. Поэтому просила знакомую из Беларуси, нашу подругу, – она сходила в церковь и поставила свечку за отца.

Мне накануне этой трагической даты обычно всегда снится отец. Несмотря на то, что мы с ним сейчас находимся на разных меридианах Вселенной, я в своих снах чувствую его заботу о нас, его волнение. Мне кажется, он и там, где-то на небе, не может найти себе места. Уверена, что он чувствует себя виноватым, что вот так нас оставил…

Не знаю, что было бы, если бы в тот вечер рядом с ним находилась мама… Ее тоже убили бы? Или тогда папу оставили бы живым?

К счастью, маме тогда повезло, она осталась жить.

– У каждого своя судьба…

– Отец знал, что за ним следят. И нам об этом рассказывал.

Убийцы выбрали какой-то оптимальный вариант, когда возможно было его устранить и не оставить при этом слишком много следов и свидетелей.

– 20 лет прошло… Но хочется верить, что все тайное когда-то станет явным…

– Ну а что за эти годы могло стать явным, если в политическом плане в Беларуси совершенно ничего не изменилось?

Я не знаю, хватит ли нервов и сил услышать, что на самом деле произошло с отцом.

– Говорили, есть какая-то видеозапись…

– У меня не хватит сил ее посмотреть… А мама сразу умрет от разрыва сердца.

– Лена, спасибо вам за этот непростой разговор. И прошу прощения, что лишний раз заставила вспомнить обо всем этом…

– Все в порядке. Эти воспоминания и мысли во мне живут. И они никуда не денутся. Наоборот хорошо, что я смогла раскрыть свою душу, поговорить об этом. Наверное, даже немного легче стало…

Ту жизнь, которая была у нас в Беларуси, – ее забыть невозможно. Это нельзя выкинуть из своего сердца. Мне кажется, это была наша настоящая жизнь.

А сейчас… Вынужденная, как будто чужая жизнь.

– Но все равно надо жить! Значит, для чего-то вам нужно было оказаться именно в Германии. Может, кстати, и для того, чтобы внук Юрия Захаренко Кирилл стал самым лучшим полицейским на свете и наконец раскрыл убийство своего деда.

– Может быть… Все закольцовано, и судьбы переплетены...

Бабушка наша ведь была здесь в конце войны, в Кельне – это как раз недалеко от того места, где мы живем. Мы в Берлине не смогли жить, поэтому вернулись сюда, в Мюнстер…

Человек всегда ищет такое место, где ему душевно будет спокойно. Но на чужой земле, наверное, вряд ли можно достичь душевного равновесия.

Люди, конечно, ко всему привыкают. А может, это действительно – такая судьба…

Марина КОКТЫШ.

КУЛУАРЫ



Кому выгоден передел рекламного рынка?

*Три года назад в Мингорисполкоме по распоряжению экс-председателя **Андрея Шорца** была создана рабочая группа по наружной рекламе. В ее состав вошли архитекторы районов, чиновники Министерства культуры и некоторых других ведомств, а также представители рекламного бизнеса.*

*В начале этого года уже при новом градоначальнике **Анатолии Сиваке** от некоторых ассоциаций поступило предложение: в связи с тем, что группа работает неэффективно, создать экспертный совет по рекламе – для выработки решений по проблемным вопросам в области упорядочения и развития наружной рекламы Минска.*

Однако пока не работает ни рабочая группа, ни совет. Но при этом в последнее время идут разговоры о том, что готовится передел рекламного рынка города в пользу неких аффилированных компаний, чему активно способствуют некоторые чиновники.

*О том, что происходит, «Народная Воля» попросила рассказать исполнительного директора Ассоциации коммуникационных и маркетинговых агентств Беларуси, экс-министра предпринимательства и инвестиций, в ведении которого находились вопросы антимонопольного регулирования и контроля за рекламой, **Александра Сазонова.***

– Александр Юрьевич, сегодня говорят о новой концепции размещения рекламы в городе. Вы в курсе?

– Нам стало известно, что в настоящее время разработаны и согласовываются так называемые схемы размещения наружной рекламы на различных улицах города. Причем эти схемы с представителями рекламного бизнеса не обсуждались. По какому принципу они разработаны – не ясно. Белорусский союз архитекторов к этой работе не привлекался. В то же время разработанная с участием бизнеса и под патронажем Союза архитекторов, одобренная на градостроительном совете Концепция размещения рекламных конструкций, совмещенная с благоустройством городской среды на проспекте Победителей, была успешно… положена под сукно. К ее реализации даже не приступали!

Рекламщиками в Мингорисполком внесены предложения по разработке схем размещения наружной рекламы с участием всех заинтересованных сторон. Наша ассоциация тоже внесла свои предложения по этому вопросу. Мы считаем, что сначала надо профессионально и качественно доделать одно, а потом уже браться за другое. Тем более что Концепцией развития наружной рекламы в Минске на 2016–2020 годы предусмотрена разработка схем размещения рекламных конструкций именно по пр.Победителей. И уж если разрабатывать схемы, то не подпольно, а с привлечением на конкурсной основе профессионалов-архитекторов, с научно обоснованным техническим заданием и последующим обсуждением.

– А сколько вообще рекламы должно быть в городе?

– В городе периодически предлагается сократить количество рекламы. Правда, никто при этом не может сказать, сколько ее все-таки должно быть. Исследований на эту тему никто в Комитете архитектуры и градостроительства (КАиГ) Мингорисполкома не проводил. Плотность рекламы как на душу населения, так и на единицу площади по сравнению, например, с Москвой у нас в Минске все равно намного меньше, даже после того, как там сократили количество рекламы. Но те, кто ратует за очередное сокращение, периодически ссылаются на опыт Москвы!

Кстати, за 2018 год количество рекламных сторон в городе сократилось более чем на 10 процентов, как и количество операторов наружной рекламы. Сокращение рекламы – это не только сокращение доходов бюджета, но и сокращение рабочих мест, уменьшение оборота товаров и услуг, снижение деловой активности. Все это надо учитывать и находить баланс между ее влиянием на облик городской среды и экономической составляющей.

– Какую часть рынка наружной рекламы представляет ваша ассоциация? И кому вообще сегодня выгоден передел рынка наружной рекламы города?

– Доля предприятий АКМА в общем количестве рекламных конструкций города составляет более 35 процентов.

Наблюдая за тем, что происходит на рынке рекламы, некоторые представители рекламного бизнеса проводят аналогии с событиями, произошедшими на рекламном рынке Киева и расцененными экспертами как передел рынка наружной рекламы города в пользу отдельных компаний под лозунгами наведения порядка, замены и упорядочения рекламных конструкций. Но я уверен, что руководство Мингорисполкома этого все же не допустит.

Представители бизнеса долгое время сталкиваются с тем, что, например, предписания о тех или иных нарушениях при эксплуатации рекламных конструкций выписываются не всем. Есть так называемая каста неприкасаемых, аналогичных нарушений со стороны которых не замечают, хотя их конструкции стоят в нескольких метрах от тех, кому выписали предписание.

Мы провели свой выборочный мониторинг и убедились в необъективности осуществляемого контроля и сделанных на его основе выводов, когда одних искусственно сделали единственными нарушителями, а других предъявили в качестве образца для подражания. Было выявлено более 90 фактов, наглядно демонстрирующих, что у компаний, которые не значатся среди нарушителей, имеется большое количество аналогичных нарушений. Об этом мы сообщили и в ГП «Минскреклама», которое проводит мониторинг состояния рекламных конструкций, и в Комитет архитектуры и градостроительства, выносящий предписания в адрес предприятий. В ответ получили отписку. И только после личного вмешательства руководителя «Минскрекламы» были приняты соответствующие меры. При этом нам так и не предоставили информацию о количестве продленных паспортов рекламы, выданных компенсационных местах, согласованных модернизациях рекламных конструкций. Поэтому трудно сделать выводы о наличии либо отсутствии практики лоббирования отдельных участников рынка.

– На ваш взгляд, кто должен войти в создаваемый экспертный совет по рекламе?

– От некоторых звучало предложение, чтобы от каждой ассоциации в совете был один функционер с правом привлечения на заседания одного эксперта. Однако мне такой расклад не нравится – он не соответствует существующей правоприменительной практике. В ныне работающих при Мингорисполкоме советах, кстати, подавляющее большинство составляют именно представители бизнеса.

Не стоит функционерам от общественных организаций пытаться монополизировать экспертный совет, выступая фильтром между бизнесом и властью. Представительство в нем должно быть действительно широким. Это позволит избежать лоббирования интересов отдельных компаний, исключит коррупционную составляющую. Когда конкуренты будут за одним столом обсуждать все нюансы, сразу будет все понятно и прозрачно.

И чиновникам не надо бояться критики – на нее надо реагировать. Особенно тогда, когда вносятся конкретные предложения по исправлению существующей ситуации. А у нас часто того, кто критикует, пытаются вообще исключить из процесса.

– Пару недель назад в одном из интервью гендиректор компании «Бигборд» Юрий Бабич сказал так: *«Пусть упорядоченная реклама станет более спокойной, но за счет возросшего трафика она сможет работать эффективнее».*

– Кто сказал, что сейчас реклама «беспокойная»? Насчет трафика – это разговор в пользу бедных. На окраине трафик не возрастет от того, что срежут рекламу в центре города. А вот те операторы, которые останутся в центре города без конкуренции, смогут более успешно осваивать рекламные бюджеты рекламодателей, и их трафик действительно возрастет. Вместе с их доходами. Отсутствие конкуренции всегда вызывает рост цен. Но по силам ли это будет белорусским рекламодателям, рекламные бюджеты которых и так много меньше, чем у их иностранных конкурентов?

Поэтому я говорю о том, что государство должно устанавливать четкие, ясные и справедливые для всех правила игры. А бизнес – широко участвовать в их обсуждении.

– Знаю, что сегодня чиновники настаивают, чтобы привычные рекламные щиты меняли на современные технологичные конструкции… И некоторые обижаются: мол, одним продлили паспорта на размещение рекламы на старых конструкциях, а от других требуют новых, инновационных!

– Ну а как бизнесменам не пугаться наведения порядка на рынке наружной рекламы, если одних это касается, а других нет? Конечно, мы за внедрение инновационных рекламоносителей. Они улучшают облик города, делают его привлекательным и современным. Но эту задачу нельзя решить одномоментно.

Нужно разработать четкие требования, какими должны быть модернизированные конструкции, дорожную карту проведения их модернизации, а не наскоком решать вопрос появления таких конструкций. Постепенно, планово, с учетом всех составляющих этого вопроса, включая финансовые возможности рынка, вопросы безопасности дорожного движения, отвлекающего участников дорожного движения фактора и т.д. Дабы в этом процессе не потерять, а приобрести.

Например, в некоторых странах предпринимались специальные меры для сохранения на рынке мелких и средних рекламораспространителей. Это делалось для того, чтобы сохранить конкурентную среду и не допустить монополизации рынка. Такой подход обозначен и в Концепции развития рекламы в Минске на 2016–2020 годы. У нас и так сократилось количество операторов рекламы и рекламных сторон. Резко упали и доходы операторов – более чем на 30 процентов. Когда альтернативы и конкуренции не будет, цены на рекламу подскочат. Это тот самый ценовой сговор, против которого ведет борьбу ФАС России. Они выявляют даже тех, кто договорился вместе поднять цены. А у нас некоторые компании открыто ратуют за это.

– В прессе прошла информация о том, что на днях вы встречались с первым заместителем председателя Мингорисполкома Федором Римашевским, обсуждали в том числе и острые вопросы. Довольны разговором?

– Встреча прошла конструктивно. Федор Викторович озвучил позицию руководства города: строгое соблюдение законодательства, равный подход к участникам рынка, широкое обсуждение принимаемых решений, учет экономической составляющей. В ближайшее время в виде совещания или «круглого стола» пройдет обсуждение поступивших от ассоциаций предложений по развитию рынка наружной рекламы города. В широком кругу, с участием и функционеров ассоциаций и работающих на рынке операторов. Представители АКМА также примут в нем участие – соответствующий список от нас уже внесен в Мингорисполком. На встрече было озвучено, что разработка схем размещения рекламоносителей на отдельных улицах города руководством не поддерживается. Это вселяет оптимизм и позволяет надеяться, что все решения по этому вопросу действительно будут приниматься с учетом мнения бизнеса, обоснованно, гласно и справедливо.

Марина ВИШНЕВСКАЯ.

ИНИЦИАТИВА

«Робім разам»

Сделать свой двор лучше может каждый.



«Час яскравых перамог!», «Твои билеты в яркое лето», «Bright year, bright you! (Яркий год, яркий ты!)». Все это лозунги II Европейских игр, к которым готовится Минск. Асфальтируются центральные улицы. Красятся фонарные столбы и остановки. На дорогах появились стильные желтые электробусы. Все лучшее – для гостей города. Которые вряд ли заглянут во дворы домов №49 по улице Сурганова и №№95, 97 и 101 по улице Куйбышева.

– А местные жители видят это каждый день, – говорит член совета Минской городской организации «Говори правду» Лера Пинчук. – Припарковаться здесь можно лишь в дневное рабочее время – мест для автомобилей явно недостаточно. Не везет и тем, кто ходит пешком. Бордюры покосились, пешеходные дорожки просели. На детской площадке устарели скамейки. Комфортной, безопасной зоны отдыха пока что нет. Это ли не оскорбительно для местных жителей? Особенно на фоне того, что делается для гостей столицы на центральных улицах. Пора изменить ситуацию!



И минские активисты «Говори правду» начали кампанию «Робім разам». Они разработали предложение по благоустройству придомовой территории за счет бюджета. Затем составили обращение в администрацию Советского района и отправились собирать подписи и мнения жильцов.

Не обошлось без дискуссий.

– А вы смотрели фильм «Дурак»? – спросил местный житель, представившийся Владимиром. – Там один добрый, наивный человек очень захотел спасти простых людей. И людей не спас, и себя погубил. Сначала его чуть не убили местные начальники. А затем избили до смерти сами же люди. Как бы чего подобного не случилось с вами…

– Вот как раз наш опыт показывает обратное! – парировал активист «Говори правду» Евгений Козловский. – В прошлом году я собрал под сотню подписей за благоустройство двора по улице Могилевской. И замдиректора ЖЭУ лишилась премии за невыполнение обязанностей, руководство ЖКХ стало встречаться с людьми. Все перестали сидеть «по хатам», возникло соседское сообщество.

– И мы убеждены: власть пойдет навстречу! – добавил один из руководителей «Говори правду» Сергей Возняк. – Недаром наша кампания называется «Робім разам»: члены «Говори правду», местные жители и власть действуют сообща.



Активисты собрали более 150 подписей за благоустройство двора на Сурганова–Куйбышева. Скоро пришел ответ из администрации.

– Летом будет проведен ямочный ремонт дворовых проездов и пешеходных дорожек, заменят и установят десять скамеек. Парковки и спортивные снаряды предлагается обустроить за счет жильцов. Мы с жильцами обсудили ответ, пошли в территориальный орган местного самоуправления, где наши предложения получили одобрение и понимание председателя: их перенаправили в «Зеленстрой» и к депутату Мингорсовета. Кроме этого, наша команда высадила во дворе молодые деревья – саженцы сосен и елей предоставило ЖЭУ. Самое главное – наши предложения нашли поддержку жителей и понимание властей. Так что сделать свой двор лучше может каждый. Главное – действовать! – говорит Лера Пинчук.

Андрей ИГНАТОВИЧ.

Более подробно о национальной кампании «Робім разам» вы можете узнать на сайте **www.zapraudu.info.**

ПАЗІЦЫЯ



Ігар БАРЫСАЎ:

«Базавае пагадненне з Еўрасаюзам павінна прымацца з пакетам палітычных прапаноў»

Беларусь і ЕС праводзяць перамовы наконт магчымасці падпісання базавага пагаднення аб партнёрстве і супрацоўніцтве. Старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Ігар Барысаў лічыць, што падпісанне гэтага важнага дакумента павінна адбывацца пры ўмове палітычнай лібералізацыі.

– Падпісанню гэтага пагаднення павінна спрыяць унясенне змен ў Выбарчы кодэкс, Закон Рэспублікі Беларусь «Аб палітычных партыях», Закон Рэспублікі Беларусь «Аб масавых мерапрыемствах», адмена Пастановы №49 Саўміна, якая рэгулюе парадак аплаты паслуг міліцыі па забеспячэнні аховы правапарадку падчас масавых мерапрыемстваў, – *гаворыць старшыня БСДП.* – Склалася практыка, калі ёсць закон, але ён не працуе, альбо працуе выключна на абмежаванне палітычных свабод грамадзян і прадстаўнікоў іх палітычных інтарэсаў – палітычных партый.

Калі казаць пра Выбарчы кодэкс, то ў ім мусяць адбыцца змены, асноўныя з якіх павінны даць магчымасць палітычным партыям, якія ўдзельнічаюць у выбарчых кампаніях, мець сваіх прадстаўнікоў у выбарчых камісіях, абмежаваць датэрміновае галасаванне і зрабіць працэс падліку бюлетэняў адкрытым і празрыстым для назіральнікаў.

У Закон «Аб палітычных партыях» неабходна ўключыць палажэнні аб фінансаванні палітычных партый і аб доступе палітычных партый да дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі.

